Акцыя

# 14 500 падарункаў

**«Вам — кнігі!..» — такія словы на працягу другой паловы мінулага года чулі адрасаты падарункаў у межах дабрачыннай гуманітарнай акцыі «Кніга — крыніца мудрасці, ведаў і навукі».**



Справа пачалася ў маі 2017 г. па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прысвечана 500-годдзю ўсходнеславянскага кнігадрукавання, таму невыпадкова ў якасці дэвізу і назвы абраныя словы Францыска Скарыны. Галоўная бібліятэка краіны стала сувязным звяном паміж тымі, хто можа і хоча дапамагчы кнігамі, і тымі, каму неабходная дапамога. Супрацоўнікі аддзела камплектавання збіралі, афармлялі і пакавалі мастацкую, пазнавальную, даведачную літаратуру па розных галінах ведаў дзеля далейшай перадачы ў дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, дамы ветэранаў, нават у пенітэнцыярныя ўстановы, а таксама ў бібліятэкі ўсіх рэгіёнаў краіны. 14 500 асобнікаў кніг атрымалі ўдзячныя чытачы. Да акцыі далучыліся дзяржаўныя і недзяржаўныя выдавецтвы, кнігагандлёвыя арганізацыі, інфармацыйныя агенцтвы, Нацыянальная і Прэзідэнцкая бібліятэкі, прыватныя асобы.

Вынікі падзеі падсумавалі напрыканцы студзеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Намеснік дырэктара Таццяна Кузьмініч шчыра дзякавала ўсім, хто дарыў і хто атрымаў падарункі, падкрэсліўшы значнасць кнігі як з'явы. Яна інфармацыйная крыніца і моцны сродак выхавання, разумення свету і сябе. А таксама — выток радасці. Апошняе пацвердзілі госці сустрэчы — насельнікі Дома ветэранаў пасёлка Ждановічы.

Намеснік дырэктара НББ выказала спадзяванне, што ініцыятыва галоўнай кніжнай скарбніцы будзе падтрыманая абласнымі, раённымі бібліятэкамі і самымі рознымі арганізацыямі, якія здольныя ўплываць на дабрабыт нацыі. «Дабрачыннасць не скіраваная ў адзіны бок, — падкрэсліла Т. В. Кузьмініч. — Дабро вяртаецца таму, ад каго пайшло ў свет».

Заключным акордам сталі 370 асобнікаў, падараваных падчас сустрэчы «асабіста ў рукі» выхаванцам дзіцячага дома № 5 г. Мінска: каб дзеці па вяртанні самі распакавалі іх, як звычайна распакоўваюць падарункі ў чаканні сюрпрызу.

«Але ёсць яшчэ 700 бібліятэк у Беларусі, і ўсе яны — дзеля нас з вамі», — адзначыла намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Таццяна Кузьмініч.

**Таццяна СТУДЗЕНКА**